УДК 821.161.3.09(072)+821.161.3.09(092)

# ВЫВУЧЭННЕ АПОВЕСЦІ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА «НАСЦЕЧКА» НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: ВЫХАВАЎЧЫ І АКСІЯЛАГІЧНЫ АСПЕКТЫ

**Г. М. Мятліцкая**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Беларусь, romannose@tut.by*

У артыкуле разглядаецца выкарыстанне дыдактычнага патэнцыялу аповесці «Насцечка» Кузьмы Чорнага на ўроках беларускай літаратуры ў 6-х класах установ агульнай сярэдняй адукацыі. Глыбокае засяроджанне на канкрэтных вузлавых псіхалагічных момантах, адлюстраваных у творы, дазволіць настаўніку сканцэнтраваць на гэтым увагу вучняў і тым самым паспрыяць іх духоўнаму станаўленню: уменню даражыць сяброўствам, удумліва адносіцца да сваіх учынкаў і нават зазірнуць у далёкія часы мінулага стагоддзя, калі жылі нашы дзяды і прадзеды, адчуць, што іх хвалявала, чым іх жыццё адрознівалася ад сённяшняга. Не спрошчаны падыход пры абмеркаванні аповесці не толькі заахвоціць вучняў да яе прачытання ў поўным аб'ёме, але і да глыбокага асэнсавання яе зместу.

***Ключавыя словы:*** аповесць; псіхалагізм; маральна-этычная праблематыка; каштоўнасная арыентацыя; выхаванне.

# THE STUDY OF KUZMA CHORNY'S STORY «NASTECHKA» AT THE LESSONS OF BELARUSIAN LITERATURE: EDUCATIONAL AND AXIOLOGICAL ASPECTS

**H. M. Miatlitskaya**

*Belarusian State University,*
*K. Marx St., 31, 220030, Minsk, Belarus, romannose@tut.by*

In the article discusses the use of the didactic potential of the story «Nastechka» by Kuzma Chorny in the lessons of Belarusian literature in the 6th grade of institutions of general secondary education. A deep focus on specific key psychological points reflected in the story will allow the teacher to pay attention of pupils on this aspects and thereby contribute to their spiritual development: the ability to value friendship, think about their behaviour and even peer into the distant times of the last century, when our grandfathers and great-grandfathers lived, to feel what worried them, how their life differed from today. An unsimplistic approach to discussing the story will not only encourage pupils to read it in its entirety, but also to deeply understand its content.

***Key words:*** story; psychologism; moral and ethical issues; value orientation; education.

Творчасць К. Чорнага ў сучасных установах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання вывучаецца ў 6-м, 9-м і 10-м класах. Пачынаецца знаёмства з творчасцю класіка ў 6-м класе пасля таго, як вучні атрымаюць уяўленне пра такія тэмы, як «Міфы», «Народныя песні», «Літаратурныя песні», прачытаюць і прааналізуюць вершы, прысвечаныя календару роднай прыроды. (У асобныя рубрыкі вучэбнага дапаможніка [1] вылучана тлумачэнне тэарэтычных паняццяў «метафара» і «ўвасабленне».)

Далей у вучэбным дапаможніку для 6-га класа ў раздзеле «Чалавек – гэта цэлы свет» змешчаны апавяданне Алены Васілевіч «Сябры» і аповесць Кузьмы Чорнага «Насцечка» (у скарачэнні), пасля якіх прадугледжана тлумачэнне такіх літаратурных жанраў, як апавяданне і аповесць. Перад гэтымі творамі пададзены кароткія біяграфічныя звесткі пра іх аўтараў.

Сярод празаічных твораў К. Чорнага ёсць такія, якія цалкам засталіся ў сваім часе (напрыклад, раман «Трэцяе пакаленне»), але ёсць і творы (напрыклад, аповесць «Насцечка»), выхаваўчы і аксіялагічны змест якіх знаходзіцца па-за часам, яны і сёння не страцілі сваёй актуальнасці ў мэтах фарміравання маральна-этычных каштоўнасцей. Аповесць «Насцечка» (1940) зведала ўплыў тагачаснай савецкай ідэалогіі, аднак ідэйнае ў ёй не дамінуе над маральным. Твор лёгка чытаецца, яго можна прачытаць за адзін прысест. Адно дзеянне імкліва змяняецца другім, за кошт гэтага ўзмацняецца дынамічнасць сюжэта. У творы спалучаны дзве сюжэтныя лініі: галоўная (непасрэдныя дзеянні персанажаў) і дадатковая, рэтраспектыўная (успаміны Мілеўскага, бацькі Сержа), якая ў школьным вучэбным дапаможніку пададзена ў скарочаным выглядзе.

Героі твора – дзеці 12–14 гадоў, таму, на наш погляд, аповесць па змесце найбольш падыходзіць для чытання ў 6-м класе. Кузьма Чорны пісаў яе спецыяльна для дзяцей, і яна потым была ўключана ў школьную праграму. Аўтар у творы мэтанакіравана ўзнімае і абвастрае найперш маральна-этычныя і выхаваўчыя праблемы. Пры гэтым гістарычны кантэкст як згадкі памяці, як тое, што не павінна ніколі быць забытым, не спрошчаны: успаміны Мілеўскага, яго жонкі і нават маці Насцечкі Закрэўскай аб’ядноўваюцца падзеямі, якія прыпалі на іхнюю маладосць, на няпростыя часы класавай барацьбы, калі Закрэўскі разам з яшчэ зусім маладым, васямнаццацігадовым Сержавым бацькам, які тады служыў парабкам, сабіралі лішкі збожжа па багатых кулацкіх хутарах для Чырвонай Арміі. Сённяшні юны чытач, нават ведаючы гістарычныя рэаліі эпохі «вялікага пералому», не мог бы аднесціся да гэтага ўстаўнога аповеду адназначна станоўча, як гэта ўспрымалася ў савецкі час. Скарочанае выкладанне гэтай сюжэтнай лініі ў цэлым не накладае адмоўны адбітак на

ўражанне ад успрыняцця вобразаў сталых герояў. Аповесць «Насцечка» наскрозь пранізана выхаваўчымі матывамі, паказана, як сямейнае выхаванне аказвае ўплыў на фарміраванне і станаўленне характару. Жывую зацікаўленасць у маленькіх чытачоў выкліча тое, што большая частка эпізодаў твора адбываецца ў школе: адлюстраваны ўзаемаадносіны паміж вучнямі ў класе, характар узаемадзеяння з настаўніцай і г. д.

Бацька Сержа, Мілеўскі, – вялікі чыноўнік. Пісьменнік не называе дакладна яго пасаду, але ў яго была службовая машына з асабістым шафёрам… «Ён быў заўсёды вельмі заняты працай, можна сказаць, што ён працаваў з цямна да цямна» [2, с. 357]. Зразумела, яму не хапала часу займацца выхаваннем сына з прычыны таго, што ён з раніцы да вечара знаходзіўся на працы, і ён адкупляўся ад сваіх бацькоўскіх абавязкаў выкананнем яго капрызаў: то грошы дасць, то выканае патрабаванне падвезці на машыне да школы на зайздрасць іншым дзецям… Аўтар паказвае, што з-за патурання бацькі ягоны сын стаў цынічным і разбэшчаным; матчына выхаванне імгненна разбуралася бацькоўскай усёдазволенасцю, таму хлопец налаўчыўся гэтым карыстацца, бо ніхто не займаўся ягоным выхаваннем, не вучыў яго разуменню нормаў маралі. Серж лічыў сябе «вышэй» за іншых дзяцей, лічыў, што ў яго ёсць права іх зневажаць, крыўдзіць. Пра такіх разбэшчаных дзяцей пазней напісаў П. Панчанка ў вершы «Бацькі і дзеці»: «На кніжцы ў бацькі – тысячы: // Як гордаю не быць! // Іх крапівой бы высекчы // І прывучыць рабіць» [3, с. 37].

Маці казала бацьку пра сына: «Гэта мы яго давялі да гэтага. Я ж бачу, – ён нікога не паважае, апроч самога сабе» [2, с. 369]. Праз словы маці пісьменнік выказвае сваё меркаванне пра тое, як правільна выхоўваць дзяцей, напрыклад: «Трэба старацца, каб з яго вырас такі чалавек, які ведаў бы, што калі ты пакасціш другому чалавеку, то лепш табе не жыць на свеце. Я ведаю, што тут выходзіць: калі ён пад’язджае на машыне к школе, то ён адчувае гэта не так, што машына аблягчае чалавеку хаду, беражэ яго сілы, а бачыць у гэтым толькі сваю перавагу перад другімі дзецьмі. Ён прывыкае з пагардай глядзець на ўсіх. Калі ў дарослага чалавека такое чорствае самалюбства, то ён не паможа другому. Такога чалавека любіць ніхто не будзе, а кожны будзе яго баяцца, а значыцца, і ненавідзець. Я не хачу, каб мой сын быў такі» [2, с. 369]. (У падручніку апушчаны сказ «Калі ў дарослага чалавека…».)

Найбольш падрабязна раскрыты ў аповесці вобразы чатырох герояў: Насцечкі і Сержа, бацькі Сержа і дзеда Насцечкі. Галоўная сюжэтная лінія твора звязана з паказам таго, што прывяло Сержа да маральнага падзення і самага ганебнага ўчынку, калі ён пакрыўдзіў дзядулю Насці, з якім сябраваў ягоны бацька, а пасля гэтага дзядуля захварэў на запаленне лёгкіх. Канфлікт Сержа з дзедам Насці, які спрабуе яго выхоўваць, пад-

рабязна апісаны ў творы. Менавіта на аналізе гэтай сітуацыі настаўнік павінен запыніць увагу вучняў для асэнсавання імі ўчынкаў Сержа, матывацыі паводзін герояў твора, разумення аўтарскага майстэрства пры стварэнні псіхалагічных партрэтаў і інш.

У кантраст амаральнасці Сержа паказана душэўная чуласць Насцечкі, якая жыве разам з дзедам, бо яе бацька памёр, а маці вучыцца ў Маскве і піша дыпломную працу. Пры гэтым дзяўчынка добра вучыцца ў школе, руплівая, старанная, працавітая. Да сваёй хваробы дзед клапаціўся аб унучцы, а калі захварэў, Насцечка стала клапаціцца аб сваім дзядуньку. Ёсць у яе і школьныя сяброўкі, якія ў складанай жыццёвай сітуацыі дапамагаюць ёй.

Кузьма Чорны псіхалагічна дакладна абмалёўвае характары падлеткаў, паказвае іх розныя тыпажы, адлюстроўвае школьныя сітуацыі, з падобнымі да якіх сутыкаюцца і сучасныя школьнікі. Тонкі знаўца чалавечай псіхалогіі, пісьменнік падкрэсліў у творы, што бацькі павінны не толькі ўдзяляць сваім дзецям ўвагу, але і вучыць іх нормам маралі, уменню адрозніваць дабро ад зла: «І яму [бацьку Сержа. – *Г. М.*] раптам стала крыўдна, што яго сын нічога не ведае аб ім, сваім бацьку, і што ён сам мала цікавіўся сваім сынам. Яму нават стала страшна ад таго, што паміж ім і яго малым няма дружбы. А без гэтай дружбы чагосьці вялікага і патрэбнага не хапае ў жыцці. Дружба тут павінна быць вялікая, моцная і вечная» [2, с. 370].

Як і ў аповесці Кузьмы Чорнага «Люба Лук’янская» (1936), у кульмінацыі твора ўсе галоўныя героі збіраюцца разам, у адным памяшканні. Гэта вышэйшы момант развіцця сюжэта, найлепшыя ўмовы для высвятлення ўзаемаадносін герояў. У эпізодзе прыходу сям’і Сержа ў госці да дзядулі Насцечкі аўтар падводзіць герояў (Сержа і яго бацьку) да ўсведамлення памылковасці сваіх каштоўнасных арыенціраў. Бацька першым зразумеў і прызнаў сваю віну перад сынам. Аўтар спецыяльна раздзяліў яго рэпліку на дзве часткі, першая з якіх была агучана бацькам для ўсіх, а другая прамоўлена ціха, каб яе пачуў толькі Серж. Шкада, гэты дыдактычны момант у вучэбным дапаможніку адсутнічае. Мудры дзед Насцечкі не стаў чакаць развязкі напружанага моманту, а перавёў увагу прысутных на сяброўак, якія прыйшлі да Насці: «О, у іх вялікае сяброўства <…> Такая ў іх дружба, што толькі цешыцца можна» [2, с. 387]. Маці Насці, якая вярнулася з вучобы і прысутнічала пры сустрэчы, таксама падтрымала дзеда: «Дружба – вялікая справа. Без дружбы чалавеку цяжка жыць, чуеце, дзяўчаткі? Дружба робіць вялікія справы. І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць. Шануйце, дзеці, дружбу, гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека. Вырастайце вялікія і аберагайце праз усё жыццё дружбу. І ведайце – асабліва моцная павінна быць тая дружба, што ўстанаўліваецца ў маленстве і ў

маладыя гады» [2, с. 387–388]. Пісьменнік дае чытачу зразумець, што момант, калі Серж стаяў «як акамянелы» ад сораму, становіцца пачаткам яго маральнага прасвятлення: яго «ўцёкі» ад самога сябе, яго рэакцыя на ўсю сітуацыю сведчаць аб гэтым. Імгненна пацярпелі крах ранейшыя перакананні Сержа: ягоны светапогляд і лад жыцця аказаліся ўсяго толькі нікчэмнымі, ганарыстымі капрызамі.

У гэтым творы галоўнай з'яўляецца тэма выхавання дзяцей. Кузьма Чорны падкрэсліў, што менавіта ад бацькоў залежыць іх выхаванне. Аўтар даходліва патлумачыў, што такое дружба, і доказна адзначыў, што ўменне сябраваць павінна закладвацца ў маладыя гады. Для вучняў 6-га класа змест гэтага твора будзе зразумелы, а гэта ў сваю чаргу зможа аказаць станоўчы ўплыў на фарміраванне і ўмацаванне іх маральна-этычных уяўленняў.

На нашу думку, па гэтай аповесці ў вучэбным дапаможніку змешчаны цікавыя і карысныя пытанні і заданні для працы вучняў: ёсць тут і апераджальныя заданні, і пытанні, накіраваныя як на пераказ твора, так і на самастойнае разважанне вучняў над тэкстам аповесці, а таксама, што важна, тлумачэнне незразумелых беларускіх слоў, пададзенае ў зносках унізе старонак, пры гэтым у словах пазначаны націск. Паслятэкставыя заданні таксама разнастайныя. Пытанні складзены аўтарамі падручніка да кожнай з частак твора, а затым – і да ўсёй аповесці ў цэлым. Гэта, на наш погляд, з аднаго боку, аблягчае працу настаўніка пры падрыхтоўцы да ўрока і падчас яго правядзення, а з другога – спрыяе больш удумліваму прачытанню і самастойнаму асэнсаванню зместу твора вучнямі, якія могуць выкарыстаць «падказкі», сфармуляваныя ў пытаннях да твора, як дома, так і на ўроку. Такім чынам, заданні для вывучэння аповесці «Насцечка» адпавядаюць узросту вучняў, спрыяюць лепшаму разуменню і засваенню зместу, а таксама дазваляюць настаўніку правесці паўнавартасныя ўрокі, накіраваныя на дыялог з вучнямі, развіццё адпаведных уменняў і навыкаў вуснага адказу на пытанні па прачытаным мастацкім творы.

На жаль, у вучэбных дапаможніках для 9-га і 10-га класаў, выдадзеных у 2020–2022 гг., заданні і пытанні па творах Кузьмы Чорнага, на наш погляд, не сфармуляваныя належным чынам, напрыклад, адсутнічаюць пытанні да кожнай з частак рамана «Пошукі будучыні», а гэта было б карысным і для вучняў, і для настаўніка, паспрыяла б лепшай падрыхтоўцы да сачынення. Не прыведзена ў гэтых падручніках і тлумачэнне адметных чорнаўскіх лексічных адзінак, хоць значэнне многіх з іх немагчыма знайсці праз пошук у інтэрнэце або там яно пададзена з памылкамі.

Матэрыял, змешчаны ў прыкладным каляндарна-тэматычным планаванні для 6-га класа па разглядаемай тэме, цалкам адпавядае зместу падручніка і структуры сфармуляваных заданняў. Пасля вывучэння

тэксту аповесці прапануецца праца над тэарэтычным артыкулам пра твор і «калектыўнае абмеркаванне жанравых адметнасцей апавядання і аповесці ў супастаўленні» [4, с. 85]. Завяршае раздзел падручніка, прысвечаны тэме сяброўства, «вуснае сачыненне з элементамі разважання», для якога прапануецца «арганізаваць калектыўную творчую працу вучняў – падрыхтоўку сачынення-разважання паводле вывучаных твораў і ўласнага жыццёвага вопыту» [4, с. 85]. Такі ўрок будзе з'яўляцца падагульненнем атрыманых ведаў і можа спрыяць глыбейшаму разуменню вучнямі паняццяў «сяброўства», «абавязак», «сямейныя адносіны», «шчасце» і інш., дасць школьнікам магчымасць для асэнсавання асабістых духоўных каштоўнасцей.

Вывучэнне гэтага твора добра падыходзіць і для таго, каб вучні зразумелі, што такое аповесць, адчулі спецыфіку гэтага жанра, змаглі растлумачыць, чым адрозніваецца аповесць ад апавядання.

А. К. Калечанка слушна адзначыў: «Адна з важных задач літаратуры – садзейнічаць станаўленню жыццёвай пазіцыі навучэнцаў (уменне выжыць у гэтым свеце), развіццю якасцей асобы. Веды па літаратуры не могуць быць мэтай толькі на ўзроўні запамінання і разумення. Жыццёва важныя, стваральныя меркаванні, перакананні павінны дасягаць больш глыбінных псіхалагічных эфектаў – прыняцця. Зыходзячы з гэтага веды, накіраваныя на фарміраванне каштоўнасных арыентацый, якасцей асобы навучэнцаў, павінны не толькі правільна разумецца, запамінацца, але і прымацца на дастаткова глыбокім узроўні» [5, с. 159].

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Бельскі А. І., Навумчык М. І., Цітова Л. К.* Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 6 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2022.
2. *Чорны К.* Збор твораў: у 6 т. Т. 4. Раман, аповесці, п'еса, публіцыстыка, 1930–1940. Мінск : Маст. літ., 1989.
3. *Панчанка П.* І вера, і вернасць, і вечнасць: вершы. Мінск : Маст. літ., 1986.
4. *Мартынкевіч С. В., Цітова Л. К.* Беларуская мова і літаратура. 6 кл.: прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне: дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі. Мінск : НІА: Аверсэв, 2022.
5. *Колеченко А. К.* Энциклопедия педагогических технологий: материалы для специалиста образовательного учреждения. СПб. : КАРО, 2006.